пастаянным, мае аднолькавую структуру, якая арыентавана на адлюстраванне беларусазнаўчай тэматыкі (падраздзел «Пра Беларусь і яе жыхароў»), а таксама на задавальненне патрэб самаадукацыйнага чытання розных груп спажыўцоў (падраздзелы: «У дапамогу прафесійнаму чытанню», «У дапамогу абітурыентам», «Кнігі і публікацыі дзецям» і інш.). Інфармацыйны патэнцыял бібліяграфічных запісаў павышаюць анатацыі на неінфарматыўныя загалоўкі; дапаможныя паказальнікі да раздзела – персанальны, прадметны і геаграфічны, надрукаваныя ў 12 нумары, пашыраюць змястоўны і персанальны віды пошуку; прадмова ў першым нумары да выдання не толькі знаёміць з асаблівасцямі бюлетэня, а дае і папярэднюю інфармацыю аб плануемых да друку дадаткаў на бягучы год. Інфармацыю аб рэцэнзіях з беларускага перыядычнага друку на выданні, уключаныя ў бюлетэнь, можна знайсці ў раздзеле «У полі зроку рэцэнзента».

За аналізуемы перыяд у бюлетэні было апублікавана 27 дадаткаў – высокаякасных рэкамендацыйных бібліяграфічных спісаў, якія маюць самастойнае значэнне. Дзякуючы дадаткам да бюлетэня, бібліятэкары могуць скарыстаць у сваёй рабоце і матэрыялы да найбольш значных дат беларускага календара, якія складаюцца з біяграфічнай ці гістарычнай даведкі і спіса літаратуры, прысвечанай разглядаемай асобе ці падзеі. Аналагічную інфармацыю, прысвечаную памятным датам сусветнага календара, бібліятэкары, спажыўцы інфармацыі могуць знайсці ў выдаваемым з 1994 г. НББ штогодніку «Знамянальныя і памятныя даты сусветнага календара» (33(1997 г.), 37(1998 г.), 28(1999 г.)).

У 1996-2000 гг. працягвалася работа ў сферы рэтраспектыўнага бібліяграфавання. Значнай падзеяй стала выданне Нацыянальнай кніжнай палатай у 1997 г. нотаграфічнага паказальніка «Музычная літаратура Беларусі, 1971-1990» (3049(1998 г.), які з'явіўся храналагічным працягам аналагічных выданняў за перыяд з 1917 па 1970 гг. і папоўніў скарбніцу крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі Беларусі.

Сярод рэтраспектыўных універсальных паказальнікаў трэба асоба адзначыць выпуск паказальніка «Тэрміналагічныя слоўнікі, 1918-1998 гг.(3115(2000 г.)). Нягледзячы на тое, што паказальнік падрыхтаваны адным з новых калектыўных суб'ектаў бібліяграфіі – Тэрміналагічнай камісіяй пры Міністэрстве адукацыі РБ сумесна з Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны – яго адрозніваe дастаткова высокі метадычны ўзровень, добрае паліграфічнае афармленне. Аўтары імкнуліся максімальна поўна адлюстраваць у паказальніку асобна выдадзеныя тэрміналагічныя слоўнікі па самых розных галінах навукі, тэхнікі, культуры, мастацтва і грамадскага жыцця. На выданні, якія адсутнічаюць у бібліятэках Беларусі, звесткі падаюцца са спасылкамі на бібліяграфічныя даведнікі. Вытрыманы патрабаванні ДАСТ да апісання дакументаў. Даведачныя анатацыі складзены не да ўсіх дакументаў, але ў свой склад уключаюць асноўныя неабходныя звесткі аб колькасных паказчыках, мове ўключаных у слоўнік тэрмінах, тэматыцы, аўтарах-складальніках, дадатках. Наяўнасць значнай колькасці дапаможных паказальнікаў – імяннога, тэматычнага, моў, геаграфічнага, храналагічнага – спрыяе не толькі разнастайным відам пошуку, але дае падставы і для правядзення бібліяметрычнага аналізу дакументальнага масіву слоўнікаў, вынікі якога яскрава прадстаўлены ў прадмове да паказальніка, падрыхтаванай навуковым рэдактарам, старшынёй Тэрміналагічнай камісіі докт. філал. навук Г. Цыркуном.

Паказальнік прац супрацоўнікаў устаноў, а таксама паказальнікі, якія адлюстроўваюць асобныя віды навуковых дакументаў працягваюць тэндэнцыю адлюстравання навуковай думкі вучоных і спецыялістаў рэспублікі. Зараз значнасць такіх паказальнікаў ўзрастае. Працягам раней вышадшых з друку выпускаў, якія выдаваліся штогодна з 1961 г. і ўключалі матэрыял з 1929 г., з'явіўся грунтоўны «Указатель изданий Академии наук БССР за 1989 год (10(1996 г.)), падрыхтаваны ЦНБ. Ён працягвае ўжо існуючую традыцыю вычарпальнага адлюстравання інтэлектуальнай прадукцыі ўсіх структурных падраздзяленняў АН у выглядзе манаграфій, тэматычных зборнікаў, аўтарэфератаў дысертацый, аператыўна-інфармацыйных матэрыялаў, прэпрынтаў, матэрыялаў канферэнцый, з'ездаў, сімпозіумаў. У паказальніку даецца роспіс тэматычных зборнікаў і перыядычных выданняў АН. Трэба адзначыць паўнату адлюстравання выданняў, уключэнне ў паказальнік малатыражных і цяжкадаступных матэрыялаў. Як і ў папярэдніх паказальніках склад даведачна-метадычнага апарата прадстаўлены прадмовай, дапаможнымі паказальнікамі імён, аўтарэфератаў дысертацый, назваў перыядычных выданняў і кніг, апісаных пад назвай. Добрым дапаўненнем мог бы быць і тэматычны дапаможны паказальнік.

Дысертацыі, абароненыя ў ВНУ – БДУ за 1957-1981 гг. і за 1982-1994 гг., ў БДПУ імя М. Танка за 1986-1996 гг. адлюстраваны ў бібліяграфічных паказальніках, якія таксама з'яўляюцца працягам раней выдаваемых дапаможнікаў і маюць агульную методыку падрыхтоўкі (1088(1998 г.)).

## Краязнаўчая бібліяграфія

В.І. Саітава

Пашырэнне краязнаўчага руху ў краіне і значнае паляпшэнне яго арганізацыі адбывалася ў непарыўнай сувязі з ростам патрэб у яго інфармацыйна-бібліяграфічным забеспячэнні. За мінуўшы перыяд працягвалася далейшая вытворчасць краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі, узбагацілася яе тэматыка, удасканальваліся метадычныя сродкі. Краязнаўчая бібліяграфічная інфармацыя была неад'емным сродкам ажыццяўлення даследаванняў беларускіх тэрыторый і населеных пунктаў, жыцця і спраў іх ураджэнцаў і дзеячоў, папулярызацыі ведаў, выхавання патрыятычных пачуццяў, вырашэння сучасных праблем рэгіянальнага развіцця. Яе падрыхтоўкай актыўна займаліся бібліятэкі, навуковыя ўстановы і асобныя вучоныя, ВНУ і іншыя вытворцы.

Значны ўклад у папаўненне краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў ўнеслі абласныя навуковыя бібліятэкі (АУНБ) і публічныя бібліятэкі, якія мэтанакіравана стварылі сістэмы дапаможнікаў гэтага зместу ці іх асобныя звенні. Дзякуючы абласным бібліятэкам і асобным ЦБС стабільна здзяйснялася



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бягучае інфармаванне аб новай літаратуры, прысвечанай абласцям, раёнам і гарадам. Выйшаў шэраг рэтраспектыўных галіновых, тэматычных, персанальных і іншых дапаможнікаў.

Усе АУНБ выпускалі універсальныя паказальнікі новай літаратуры аб абласцях, разлічаныя на краязнаўцаў-навукоўцаў і аматараў, выкладчыкаў і навучэнцаў усіх звенняў сістэмы агульнай і спецыяльнай адукацыі, галіновых спецыялістаў і кіраўнікоў. Большасць абласных бібліятэк падтрымлівалі аптымальны штоквартальны выпуск гэтых паказальнікаў, за выключэннем Гомельскай АУНБ, якая выдавала рэтраспектыўныя штогоднікі. Ва універсальных паказальніках адлюстроўваліся розныя віды дакументаў: кнігі, матэрыялы з кніг, артыкулы са зборнікаў, часопісаў, газет, рэцэнзіі, ноты, друкаваныя творы выяўленчага мастацтва, картаграфічныя матэрыялы. Напрыклад, у паказальніку «Новая літаратура аб Гомельшчыне за 1995 год» (3366(1998 г.)) распісана 67 газет і 19 часопісаў. Важна падкрэсліць, што ў гэтых паказальніках найбольш поўна бібліяграфуюцца артыкулы з мясцовага перыядычнага друку, якія змяшчаюць унікальныя матэрыялы аб малых тэрыторыях. Штогадовы аб'ём некаторых з іх дасягаў звыш трох тысяч бібліяграфічных запісаў. У цэлым гэтыя бібліяграфічныя выданні абласных бібліятэк вызначаюцца высокім метадычным узроўнем. Добра распрацаваны даведачна-метадычны апарат, у складзе якога асабліва важную ролю выконваюць дапаможныя імянны і геаграфічны паказальнікі, пералікі распісаных перыядычных выданняў; шырока прымяняемыя ўдакладненні да назваў (даведачныя анатацыі) канкрэтызуюць змест адлюстраваных матэрыялаў. Магчыма выказаць невялікія метадычныя заўвагі ў дачыненні да асобных універсальных краязнаўчых паказальнікаў. Пажадана ўвядзенне тэматычных падрубрык да геаграфічных рубрык з вялікай колькасцю бібліяграфічных запісаў; выдзяленне ў дапаможных паказальніках моўных радоў (на беларускай, рускай ці іншых мовах); у асобных пераліках «калгасаў» і «саўгасаў» не варта паўтараць гэтыя словы пры назве кожнай з гаспадарак (добрым узорам можа быць прыклад састаўлення такіх дапаможных паказальнікаў Магілёўскай і Мінскай АУНБ). У паказальніку «Новая літаратура аб Гомельшчыне за 1995 год (3366(1998 г.)) варта тыпы геаграфічных аб'ектаў вызначаць пасля, а не перад іх найменнямі. Мінскай АУНБ пажадана палепшыць прадмову.

Адмысловай з'явай развіцця краязнаўчай бібліяграфіі апошняга пяцігоддзя стаў удзел ЦБС у стварэнні комплексных па зместу дапаможнікаў аб раёнах і гарадах тыпу «Новая літаратура аб краі» (2882(1997 г.), 3367(1998 г.), 3204(1999 г.)). Гэта бібліяграфічная прадукцыя даволі разнастайная па прыкметах мэтавага і чытацкага прызначэння, параметрах адбору дакументаў, спосабах бібліяграфічнай характарыстыкі, перыядычнасці і формы публікацыі (значная частка друкуецца на старонках мясцовага перыядычнага друку). Так, рэкамендацыйны спіс артыкулаў з перыядычнага друку Беларусі і бліжняга замежжа «Горад Мінск: Гісторыя і сучаснасць» штоквартальна рыхтавала ЦБ імя Я. Купалы.

Некалькі ўмацавалася падрыхтоўка календароў знамянальных і памятных дат (3364(1998 г.), 3202(1999 г.)) (некаторыя ЦБС друкавалі іх у мясцовай перыёдыцы). Складаліся календары паводле традыцыйнай, добра распрацаванай методыкі, якая дазваляе ўдала спалучаць фактаграфічную і бібліяграфічную інфармацыю.

Шэраг тэм упершыню атрымаў бібліяграфічнае адлюстраванне ў рэтраспектыўных дапаможніках. Наватарствам вызначаецца дзейнасць Магілёўскай абласной бібліятэкі, якая падрыхтавала адмысловыя бібліяграфічныя паказальнікі і даведнікі «Выпускнікі і навучэнцы Магілеўскай мужчынскай гімназіі» (996(1999 г.)). «Гісторыя вёсак Магілёўшчыны (2879(1997 г.)), «Даследчыкі роднага краю» (2285(1996 г.)), «Мовазнаўцы Магілёўшчыны» (2975(1999 г.)), «Народная асвета Магілёўшчыны» (715(1999 г.)), «Помнікі і памятныя мясціны Магілёўшчыны» (2017(1996 г.)), «Тэатральная творчасць Магілёўшчыны» (3070(1998 г.)), «Філіповіч Іеранім Іосіфавіч» (3205(1999 г.)) і інш. Кожны з гэтых дапаможнікаў – важкі ўклад у фарміраванне сістэмы краязнаўчай інфармацыі аб вобласці, у забеспячэнне інфармацыйных патрэб сучаснага краязнаўства, а таксама прыклад іншым бібліятэкам па шляху распрацоўкі змястоўных накірункаў у краязнаўчай бібліяграфічнай рабоце. Бібліёграфы-складальнікі Магілёўскай абласной бібліятэкі добра валодаюць майстэрствам бібліяграфічнай папулярызацыі і бібліяграфавання для забеспячэння патрэб навуковай і педагагічнай дзейнасці. Напрыклад, колькі цікавых звестак, сабраных па крупіцах, змешчана ў даведачных артыкулах паказальніка «Вуліцы горада расказваюць…»(3326(2000 г.)), прысвечанага Магілёву! Артыкулы правамерна маюць аўтарскія подпісы бібліёграфаў. Сам жа дапаможнік дакладней было б назваць рэкамендацыйным бібліяграфічным даведнікам. Для археалагічнага вывучэння Магілёўшчыны важнае значэнне мае раздзел «Архіўныя матэрыялы» у бібліяграфічным даведніку «Археалагічныя помнікі Магілёўшчыны» (3178(1999 г.)). У ім прыведзены 239 пазіцый – апісанняў справаздач, даведак, інфармацый па выніках праведзеных археалагічных экспедыцый на Магілёўшчыне за даваенны і пераважна пасляваенны час, якія знаходзяцца ў фондзе архіва Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Для краязнаўчых бібліяграфічных выданняў гэтай бібліятэкі характэрным з'яўляецца адлюстраванне розных відаў дакументаў, шырокія храналагічныя межы, дата заканчэння адбору, умелае ўжыванне фактаграфічнай інфармацыі.

Пры стварэнні шэрагу дапаможнікаў абласная бібліятэка цесна супрацоўнічала з Магілёўскім дзяржаўным універсітэтам і іншымі арганізацыямі і ўстановамі. Юбілей кафедры беларускай мовы, аднаўленне падрыхтоўкі географаў і стварэнне кафедры геаграфіі ва універсітэце, выкарыстоўваліся для распрацоўкі арыгінальных бібліяграфічных дапаможнікаў (3178(1999 г.), 1213( 2000 г.)). Вучоныя падрыхтавалі інфармацыйна насычаныя і цікавыя ўводзіны да бібліяграфічных прац, дапамаглі забяспечыць належную якасць асвятлення тэмаў. Як пажаданне можна прапанаваць краязнаўцам Магілёўскай АУНБ прыступіць да адлюстравання ў навукова-дапаможных паказальніках гістарычнай тэматыкі польскамоўнай літаратуры, якая змяшчае багатую інфармацыю пра магілёўскі край.

На жаль, аб паказальніках іншых бібліятэк органы бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі змяшчаюць вельмі мала інфармацыі, што выклікае пэўную трывогу наконт магчымасцей гэтых бібліятэк забяспечыць вытворчасць сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў. Паменшыла, напрыклад, выпуск

рэтраспектыўных краязнаўчых дапаможнікаў Мінская АУНБ, захаваўшы пераважна падрыхтоўку рэкамендацыйнай бібліяграфічнай літаратурнай інфармацыі, прысвечанай творчасці пісьменнікаў землякоў (3079(1999 г.)). Станоўча, што бібліятэка працягвае выданне краязнаўчых матэрыялаў у вядомай бібліяграфічнай серыі «Што чытаць далей» (25 дап.(1999 г.)). Тэму літаратурнага краязнаўства паспяхова асвятліла Лельчыцкая ЦБС (3254(1998 г.)).

Асобныя галіны і тэмы развіцця Гродзеншчыны знайшлі адлюстраванне ў рэтраспектыўных паказальніках «Здравоохранение Гродненской области» (1878(1999 г.)), «Гісторыя горада Ліды» (2945(1997 г.)).

Каштоўныя, нярэдка унікальныя краязнаўчыя бібліяграфічныя матэрыялы, прысвечаныя асобным беларускім мясцінам былі апублікаваны ў выглядзе аглядаў, прыкніжных і прыартыкульных спісаў літаратуры, падрадковых бібліяграфічных заўваг. Асабліва шмат іх змешчана ў манаграфіях, зборніках, матэрыялах шматлікіх краязнаўчых канферэнцый, у рэгіёназнаўчых даведачных і вучэбных выданнях. Для гэтых бібліяграфічных матэрыялаў характэрны глыбокі храналагічны ахоп дакументаў, разнастайны відавы і моўны састаў. Бібліяграфічнае адлюстраванне гістарычных першакрыніц, афіцыйных дакументаў асобных эпох, літаратуры на польскай і іншых замежных мовах адбываецца ў асноўным у гэтых бібліяграфічных крыніцах. Многія выданні маюць персанальныя, геаграфічныя і іншыя дапаможныя паказальнікі. Напрыклад, спіс літаратуры да манаграфіі С.В. Тарасава «Полацк, IX-XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія» (3394(1999 г.)) адлюстроўвае 118 назваў дакументаў; да працы А. Карлюкевіча «Літаратурная карта Пухавіччыны» складзены імянны і геаграфічны паказальнікі. Вельмі добра распрацаваны даведачна-пошукавы апарат да кнігі А.Т. Федорука «Старинные усадьбы Минского края», які ўключае спіс архіўных крыніц (з 54 пазіцый) і літаратуры (219 назваў з канца XVIII па XX стст. на беларускай, рускай і польскай мовах), імянны і геаграфічны паказальнікі, два слоўнікі. Каштоўную бібліяграфічную інфармацыю, як правіла, у выглядзе падрадковых заўваг змяшчаюць гісторыка-дакументальныя хронікі «Памяць». На жаль, прыкніжныя спісы літаратуры ў іх афармленні былі выключэннем (як, напрыклад, у кнізе, прысвечанай Горацкаму раёну(2375(1996 г.)).

Бібліяграфічную інфармацыю аб краях магчыма выяўляць і па патоку першасных і другасных беларусазнаўчых дакументных крыніц.

У цэлым паток краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі, створанай за пяцігоддзе, вызначаўся не толькі вялікім аб'ёмам, але і шырокім асартыментам тыпаў, форм, жанраў, цікавымі і карыснымі метадычнымі знаходкамі. Шкада, што многія бібліятэкі не адлюстроўвалі краязнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі ў органах бягучай дзяржаўнай бібліяграфіі. Хацелася б, каб у гэтых крыніцах краязнаўчыя дапаможнікі адлюстроўваліся ў бібліяграфічным падраздзяленні, а з галіновымі структурнымі падраздзяленнямі былі звязаны спасылкамі.

## Бібліяграфічныя дапаможнікі па сацыяльных і гуманітарных навуках

Л.І. Даніленка

У 1996-2000 гг. бібліяграфічныя рэсурсы сацыягуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь папоўніліся апублікаванымі крыніцамі інфармацыі амаль па ўсіх галінах сацыяльнай сферы і сацыягуманітарных навук.

Сярод іх, як і раней, існавалі дапаможнікі, якія адлюстроўваюць дакументы, прысвечаныя розным галінам сацыяльнай сферы Беларусі, звязаныя з Беларуссю па аўтарскай прыкмеце, месцы знаходжання і месцы выдання, а таксама разлічаныя на задавальненне патрэбнасцяў карыстальнікаў інфармацыі Рэспублікі Беларусь у сусветных інфармацыйных рэсурсах.

З *перыядычных* бібліяграфічных выданняў *беларусазнаўчай тэматыкі* адзначым паказальнік Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «Новая літаратура па культуры і мастацтву» (25(1996 г.), 35(1997 г.), 39(1998 г.), 29(1999 г.), 40(2000 г.)), арыентаваны на задавальненне прафесійных патрэбнасцей у інфармацыі аб культуры Беларусі ў цэлым, у т.л. такіх яе галінах як сацыякультурная дзейнасць у сферы вольнага часу, бібліятэчная справа, бібліяграфія, музейная справа, ахова помнікаў гісторыі і культуры, сродкі масавай інфармацыі. У назве гэтага паказальніка варта было б падкрэсліць яго беларусазнаўчы змест у адпаведнасці з адкрэсленымі ў рэдакцыйна-выдавецкай анатацыі прынцыпамі адбору матэрыялу.

У штогодніках «Эканоміка Рэспублікі Беларусь» (479-80(1998 г.)) Прэзідэнцкай бібліятэкі канцэнтраваліся звесткі аб дакументах па міжгаліновых пытаннях развіцця рынкавай эканомікі краіны, аб гаспадарцы абласцей і гарадоў, палескай зоны, галіновых эканоміках вытворчай і невытворчай сферы.

На жаль, пасля больш чым 35-гадовага існавання перапынілася выданне бібліяграфічнага штогодніка «Навука і навукова-даследчая работа ў Беларусі» ЦНБ НАН (11(1997 г.)), які інфармаваў аб дакументах па гісторыі, сучасным стане і перспектывах развіцця навукі ў Беларусі, арганізацыі навукова-даследчай работы ў навуковых установах сістэмы Акадэміі навук, ведамасных навукова-даследчых інстытутах, вышэйшых навучальных установах, аб з'ездах, канферэнцыях і нарадах, персаналіях дзеячаў беларускай навукі.

У бібліяграфічным паказальніку «Чарнобыль» (2466(1998 г.), 2465(2000 г.)), якому ўласцівы комплексны падыход да адлюстравання дакументаў па тэме, значнае месца займае інфармацыя аб публікацыях па сацыягуманітарных аспектах катастрофы: прававых, сацыяльна-эканамічных, дэмаграфічных, сацыяльна-псіхалагічных, праблеме «дзеці Чарнобыля», аб дзейнасці міжнародных арганізацый, арганізацый і рухаў краін свету па аказанню гуманітарнай дапамогі ахвярам Чарнобыля, дзейнасці царквы па пераадоленню наступстваў катастрофы і інш. Гэтае выданне – прадукт дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, ЦНБ Акадэміі навук, Прэзідэнцкай бібліятэкі, а таксама рэспубліканскіх – навукова-тэхнічнай, сельскагаспадарчай, педагагічнай бібліятэк, Брэсцкай абласной



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ